Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

ПАМЫЛКІ ПРЫ ПАСАДЦЫ ЦЮЛЬПАНАЎ

Мінулай восенню пасадзіла цюльпаны. Увесну яны раслі вельмі слаба і амаль не было кветак. У чым прычына?

Валянціна Няхайчык,
г. Пінск.

Прычын можа быць некалькі.

1. Магчыма, цыбуліны былі занадта заглыблены. Звычайна глыбіня пасадкі вызначаецца памерам цыбуліны і складае тры яе вышыні (пры вышыні цыбуліны 4 см яе высаджваюць на глыбіню 12 см).

2. Адлегласць паміж цыбулінамі пакідаюць не менш за 10 см.

3. Вельмі важная падрыхтоўка глебы пад цюльпаны. Яны не выносяць кіслых глеб, такія ўмовы неспрыяльна адбіваюцца на цвіценні.

4. Істотна ўплывае на цвіценне тэмпературны рэжым, пры якім фарміраваліся цыбуліны.

Калі ў перыяд пасля выкопвання цыбуліны захоўваліся ў прахалодных умовах, гэта магло адбіцца на закладцы кветкавых пупышак. Пасля завядання лісця, засыхання кветканоса і адмірання каранёў у глебе застаецца цыбуліна, якая ўступае ў перыяд летняга спакою. Менавіта ў гэты момант у цыбуліне закладваюцца і фарміруюцца кветкі парасткаў будучага года і новая пупышка аднаўлення. У месцах натуральнага росту цюльпанаў, у Сярэдняй Азіі, гэта перыяд гарачага і сухога лета. У гэты час пад уплывам высокай тэмпературы стымулюецца працэс фарміравання кветак. Цыбуліны, якія застаюцца ў глебе ва ўмовах халаднаватага і сырога лета сярэдняй паласы, аказваюцца ў неспрыяльных умовах для закладкі кветкавых пупышак.

Рэкамендуецца штогод пасля заканчэння цвіцення выкопваць цыбуліны, прасушваць іх і захоўваць першыя 4–5 тыдняў пры тэмпературы 23–25 градусаў. Затым тэмпературу паступова зніжаюць да 17–20 градусаў і ў такіх умовах захоўваюць да высадкі ў грунт у канцы верасня — пачатку кастрычніка.

СНЕЖНАЯГАДНІК

Назва гэтага дэкаратыўнага куста ўтварылася з-за афарбоўкі ягад. Амаль ва ўсіх відаў снежнаягадніку плады белага колеру, і толькі ў снежнаягадніку кітайскага яны чорныя.

Белы снежнаягаднік цвіце на працягу ўсяго лета далікатнымі ружовымі кветкамі, сабранымі ў суквецце-гронку. Белыя ягады з'яўляюцца ў верасні-кастрычніку. Расліна адрозніваецца павышанай устойлівасцю да неспрыяльных умоў асяроддзя пражывання, таму актыўна выкарыстоўваецца ў дэкаратыўным азеляненні. Паколькі снежнаягаднік засухаўстойлівы, марозаўстойлівы і ценевыносліўы, то выбраць участак для пасадкі раслін будзе не цяжка. Але для раскрыцця яго прыгажосці лепш за ўсё падыходзяць сонечныя ўчасткі з урадлівымі суглінкамі, якія маюць нейтральную або слабашчолачную рэакцыю глебы.

ПАСАДКА

Перад тым як брацца за высаджванне расліны на ўчастку, глебу варта перакапаць і дадаць арганічныя ўгнаенні. Пасадкавыя ямы запаўняюць сумессю торфу, кампосту і перагною. Дадаткова на кожную расліну ўносіцца суперфасфат (200 г) і драўняны попел (600 г). Кусты размяшчаюць на адлегласці 1–1,5 м адзін ад аднаго.

Пры выкананні санітарнага і фарміровачнага абразання варта памятаць, што кветкавыя пупышкі закладваюцца на парастках бягучага года.

Фарміровачныя абрэзкі праводзяць вясной, парасткі кароцяць прыкладна на палову даўжыні. Абразанне «на пень» робіцца на старых раслінах, якія маюць патрэбу ў амаладжэнні.

РАЗМНАЖЭННЕ

Спосабаў размнажэння снежнаягадніку існуе досыць шмат. Яго можна размнажваць тронкамі, каранёвым пасцянкам, насеннем, дзяленнем куста і адводкамі. Багаты каранёвы пасцянок снежнаягадніку паспяхова выкарыстоўваецца для размнажэння раслін на працягу ўсяго сезона.

Дзяленне куста праводзяць альбо вясной, альбо восенню. Расліны выкопваюць і дзеляць разам з каранёвай сістэмай. Пры размнажэнні адводкамі можна зрабіць спецыяльную канаўку, у якую накіроўваюць парасткі снежнаягадніку, прыкруціўшы іх дротам. Да канца вегетацыйнага перыяду ў адводкаў сфарміруецца магутная каранёвая сістэма, і расліны можна аддзяліць секатарам і перасадзіць на жаданае месца.

Пры размнажэнні тронкамі можна выкарыстоўваць адраўнелыя або зялёныя тронкі. Адраўнелыя нарыхтоўваюць восенню і захоўваюць у пяску ў прахалодным памяшканні. Зялёныя тронкі пачынаюць нарыхтоўваць пасля перыяду цвіцення (чэрвень). Правяраюць прыдатнасць чаранкоў наступным чынам: парастак згінаюць, і калі ён ламаецца з хрустам, значыць, выспеў і падыходзіць для нарыхтоўкі чаранкоў.

Насенны спосаб ужываюць рэдка, бо насенне ў снежнаягадніку дробнае і працэс атрымання паўнавартасных раслін займае занадта шмат часу.

Даты Падзеі Людзі

1848 год — нарадзіўся (горад Магілёў) Вацлаў Пятровіч Федаровіч, беларускі краязнаўца, калекцыянер, юрыст, член-карэспандэнт Кракаўскай АН, ганаровы член Віцебскай вучонай архіўнай камісіі. Працаваў у Сараташе, Царыцыне, Ерэване. З 1884 г. жыў і працаваў у Віцебску. Дапамагаў пры раскопках археолагам, калекцыянаваў зброю, этнаграфічныя і нумізматычныя матэрыялы. У бібліятэцы Федаровіча (больш за 1 тысячу тамоў) былі кнігі па гісторыі Беларусі і Літвы, беларускія і літоўскія выданні XVIII-XIX стст. Свае артыкулы па гісторыі краю публікаваў у «Витебских губернских ведомостях». Укладальнік літаратурна-краязнаўчага зборніка «З ваколіц Дзвіны». Распрацаваў статут Беларускага вольна-эканамічнага таварыства. У 1920 г. на базе яго калекцыі арганізаваны своеасаблівы музей старажытнасцяў імя В. Федаровіча, які ў 1924 г. стаў часткай Віцебскага абласнога краязнаўчага музея. Памёр у 1911 годзе.

1906 год — нарадзіўся Дзмітрый Шастаковіч, вядомы савецкі кампазітар, піяніст, педагог і грамадскі дзеяч. Народны артыст СССР, Герой Сацыялістычнай Працы. Лаўрэат пяці Сталінскіх прэмій, Ленінскай прэміі, Дзяржаўнай прэміі СССР. Адзін з найбуйнейшых музычных дзеячаў XX стагоддзя. Прадзед Шастаковіча па бацькавай лініі — Пётр Міхайлавіч Шастаковіч — нарадзіўся ў беларускім мястэчку Шэметава (Завілейскі павет Віленскай губерні). Музыка Д. Шастаковіча — гэта мастацтва, прасякнутае любоўю да чалавека, верай у яго высакароднасць, волю і розум. Пра тое, што адбывалася ў Савецкім Саюзе і ва ўсім свеце, Дзмітрый Дзмітрыевіч Шастаковіч гаварыў з вастрынёй асабістага перажывання. Ён не спакойны летапісец, а палкі, глыбокі драматург і мысліцель. Такім ён выявіўся і ў творах, звязаных з сучаснасцю, напрыклад, у сёмай і восьмай сімфоніях, і ў тых, якія прысвечаны гістарычным падзеям. Сімфоніі і аратарыяльныя творы, оперы, канцэрты, квартэты, вакальныя цыклы — творы Шастаковіча патрабуюць глыбокага ўслухоўвання і доўгага «ўчытвання». У знак прызнання заслуг кампазітара Акадэмічная філармонія ў Санкт-Пецярбургу і Дзяржаўны квартэт Расіі сёння носяць яго імя.

1949 год — 65 гадоў таму нарадзіўся (Рухча 2-я Столінскага раёна) Іван Міхайлавіч Лемяшэўскі, беларускі вучоны-эканаміст, доктар эканамічных навук (1993), прафесар (1996). У 1970 годзе скончыў Беларускі інстытут народнай гаспадаркі, у 1986-м — Мінскі педагагічны інстытут замежных моў. Аўтар навуковых прац па гісторыі эканамічных вучэнняў, фінансах, трансфармацыі сучасных эканамічных сістэм.

Было сказана

Мікалай ЯСТРЭБСКІ, інжынер-будаўнік, літаратар:
«Так здараецца, калі хтосьці, жадаючы пераскочыць праз шырокі роў, адступае назад, каб разбегчыся».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.00	19.01	12.01
Віцебск —	6.50	18.51	12.01
Магілёў —	6.50	18.51	12.01
Гомель —	6.47	18.48	12.01
Гродна —	7.15	19.17	12.02
Брэст —	7.16	19.17	12.01

Месяц

Маладзік 24 верасня.
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Аляксея, Дзмітрыя, Сямёна, Фёдара, Юльяна.*
К. *Амеліі, Аўрэліі, Святаполка, Сяргея, Уладзіслава.*

ЗАЎТРА

Фота Алесі ВАРАБ'ЁВАЙ.



УСМІХНЕМСЯ

Пра джэнтльмена і сапраўднага джэнтльмена.

Джэнтльмен — гэта мужчына, а сапраўдны джэнтльмен — гэта жаночыя фантазіі.

Доктар раіць знаёмаму:
— Калі табе дрэнна ноччу, пахмелле, не можаш спаць — выпі крыху гарэлкі і кладзіся!
— Ды як я лягу спаць, калі яшчэ засталося?!

Я не ўмела садзіцца на шпагат да таго часу, пакуль не зварыла дзіцяці кісель...

Дырэктар турбазы — гэта чалавек, якога паважаюць толькі з мая па верасень.

НАРОДЖАНЫЯ 25 верасня

У іх цікавыя адносіны з грамадствам. З аднаго боку, ад яго залежаць іх сродкі існавання і, нарэшце, поспех, а з другога боку, гэтыя людзі часта крытыкуюць недахопы, імкнучыся гэтым прадэманстраваць як можна палепшыць існуючы парадак. Яны часта адчуваюць цяжкасці ў пошуку шляхоў выражэння сваіх эмоцый і пачуццяў у міжасобасных стасунках і асабістых прыхільнасцях. У адносінах з сябрамі яны паводзяць сябе досыць лаяльна. Яны валодаюць развітай фантазіяй, вельмі дакладныя і прыдзірлівыя. Часта некалькі разоў правяраюць зробленае, каб знайсці памылкі і ўмацаваць слабыя месцы. Яны павінны памятаць, што словы могуць прынесці больш шкоды, чым фізічныя дзеянні, і імкнуцца быць больш адкрытымі ў адносінах і пачуццях.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар—галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.063. Індэкс 63850. Зак. № 3906.

Нумар падпісаны ў 19.30 24 верасня 2014 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12